УДК 37.017:801.8

Т.М. Федарцова

# РОЛЯ ТЭКСТУ Ў ІДЭЙНА-МАРАЛЬНЫМ І ГРАМАДЗЯНСКА- ПАТРЫЯТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ

Фарміраванне камунікатыўнай і лінгвакультурнай кампетэнцый, што цесна спалучана з авалоданнем навучэнцамі маўленчай дзейнасцю, культурай маўленчых паводзін, а таксама неабходнымі звесткамі пра асновы ідэалогіі Дзяржавы, культуру, гісторыю і традыцыі беларускага народа, непасрэдна звязана з падборам тэкстаў. Для сучаснага мовазнаўства характэрна разнастайнасць навуковых метадаў і падыходаў, якімі карыстаюцца пры вывучэнні асноўнага прадмета. Але пры выкарыстанні любога інавацыйнага метаду важна правільна падабраць тэкст, каб ён не толькі садзейнічаў выпрацоўцы ўмення выкарыстоўваць арфаграфічную і пунктуацыйную пісьменнасць, але і нёс у сабе выхаваўчыя аспекты. Таму пры знаёмстве з афіцыйна-дзелавым стылем студэнтам быў прапанаваны пераклад з Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. З асноўных палажэнняў выбраны правы і абавязкі навучэнцаў, што дало магчымасць кожнаму студэнту больш асэнсавана прааналізаваць права свайго выбару і адпаведнасці сваіх паводзін у ВНУ. Знаёміліся студэнты і з “Ключавымі аспектамі паслання Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу”. Падобныя тэксты дапамагаюць студэнтам больш стала разважаць аб ідэалагіных набытках Дзяржавы і вучыцца арганізоўваць узаемасувязь сваіх ведаў з вырашэннем канкрэтных праблем дзяржаўнага будаўніцтва, а таксама выпрацоўваецца ўменне правільна класікаваць афіцыйныя дакументы.

Улічваючы неабходнасць выкарыстоўваць на занятках па беларускай мове прафесійную лексіку, даволі часта падбіраюцца тэксты, звязаныя непасрэдна з будучай прафесіяй. Так студэнты факультэта ТТЛП спецыяльнасці ЭТЭМ рабілі пераклад тэксту “Альтэрнатыўная энергетыка – крок у будучае”. Ім было прапанавана выказаць свае меркаванні па дадзенай праблеме. Звычайны тэкст для студэнтаў іншых спецыяльнасцей у будучых энергетыкаў выклікаў бурную дыскусію. Ніхто не адмаўляў ролю атамнай энергіі, але разам з тым прапаноўвалася актыўна выкарыстоўваць малыя ГЭС, біяпаліва, энергію ветру і сонечныя батарэі. Так выхоўваецца грамадзянскасць.